**УДК 821.161.3-31*А.Мрый**

*А. А. Пацягова*

# ПРЫКМЕТЫ КРУЦЕЛЬСКАГА І АВАНТУРНАГА РАМАНА Ў “ЗАПІСКАХ САМСОНА САМАСУЯ” АНДРЭЯ МРЫЯ

*Мэтай артыкула з’яўляецца выяўленне ў творы А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя” тых асаблівасцей, якія характэрны для круцельскага і авантурнага раманаў. Асаблівая ўвага надаецца спосабам стварэння героя-пікара. Аўтарам падкрэслівае, што пісьменнік звяртаецца да традыцый названых жанраў з мэтай выкрыцця прайдзісвецтва і кар’ерызму, духоўнага жабрацтва і маральнай разбэшчанасці актывістаў рэвалюцыйнага часу.*

Круцельскі і авантурны раманы генетычна звязаны з прыгодніцкім. Гэта надзвычай шырокае жанравае паняцце, дэфініцыя якога не вылучаецца строгай дакладнасцю патрабаванняў. Кожная адметнасць, якая адносіцца да авантурнай, дэтэктыўнай, рыцарскай, пікарэскнай літаратуры, ужо ўтрымлівае элементы прыгодніцкага рамана. Авантурны і пікарэскны раманы традыцыйна будаваліся як раманы прыгод герояў. Выпрабаванні з’яўляліся своеасаблівай праверкай, дазвалялі герою атрымаць багацце і становішча ў грамадстве.

Андрэй Мрый назваў твор “Запіскі Самсона Самасуя” спачатку аповесцю, пазней – раманам. Твор гэты сатырычны, травесційны, напісаны ў форме дзённіка ад імя галоўнага героя Самсона Самасуя. Кампазіцыйна складаецца з дзвюх частак (“скруткаў”), дваццаці раздзелаў (11+9). Кожны раздзел можна лічыць закончанай навелай ці апавяданнем, апісаннем пэўнай падзеі з жыцця героя. Раману ўласцівы каларытнасць мовы, гаваркія прозвішчы, характаралагічныя дэталі, высмейванне савецкага быцця, выкрыццё глупства, дэмагогія, самазахапленне як агульначалавечая рыса, здаровы смех, грубаваты народны гумар, дзе дазволены нават непрыстойнасці і фізіялагічныя падрабязнасці. Твор пра кар’ерыста Самасуя, які для свайго эгаістычнага жадання і кожнага бязглуздага праекта знаходзіць правільнае ідэалагічнае “падмацаванне”.

У рамане А. Мрыя асуджаецца самасуеўшчына, якая атаясамліваецца з маральным злом, чорным павоем прыстасаванства, прайдзісвецтва, кар’ерызму і невуцтва, якія аб’ядналіся ў адным чалавеку. Галоўны герой Самсон Самасуй, авантурыст і прайдзісвет, – тыповы савецкі чыноўнік, які мае шмат пасадаў і як быццам бы шмат працуе, робіць выгляд, што многім цікавіцца, але на самай справе нічым не займаецца. Такімі рысамі заўсёды надзяляецца сапраўдны пікара. “Герой ранейшых класічных *плутовских* раманаў быў не суб’ектам, а аб’ектам сваіх прыгодаў, бо ён іх не арганізоўваў, а рабіўся толькі ахвярай падзей і абставін. Нашыя героі становяцца кавалямі ўласнага шчасця, бо найчасцей усе супярэчліва-смешныя калізіі ствараюць сваімі рукамі. Мала таго, яны няблага рэжысуюць. Схільнасць да тэатральнасці – адна з асноўных рыс Самсона Самасуя <…>” [1, с. 85], – слушна адзначае І. Штэйнер.

Аўтар рамана па-майстэрску аб’ядноўвае ў творы розныя прыёмы і сродкі сатырычнага пісьма. Вядучым сродкам становіцца самараскрыццё героя. Па сутнасці, гэта дзённік Самсона Самасуя, якому герой давярае многае, шчыра дзеліцца з ім думкамі пра тое, як ён адносіцца да іншых людзей, не таячыся, расказвае пра ўсё, што з ім здараецца. Усё гэта характарызуе персанажа знутры: самаўпэўнены, пыхлівы, ён думае, што можа гвалтоўна мяняць ўсё на свой капыл, як яму здаецца правільным. Самсон не саромеецца расказваць пра свае адносіны да сяброў, начальнікаў, дзяўчат, апісвае сваю бурную дзейнасць на пасадзе загадчыка аддзела “культпрацы”. Самасую падабаецца яго ініцыятыўнасць, аператыўнасць, кемлівасць, вынаходлівасць у барацьбе з тымі, каго ён

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лічыць сваімі ворагамі, у іх лік трапляюць і нядаўнія сябры. Ён любіць сябе пахваліць. Усё гэта дзеля кар’еры, каб дагадзіць начальству.

Сітуацыя зносін героя-апавядальніка з чытачом у класічным круцельскім рамане перадаецца праз пралог. А. Мрый таксама не парушае гэтую традыцыю. У пралогу Самсон Самасуй расказвае аб сваім мінулым хоць і не вельмі разгорнута, але апантана, захоплена. Мы даведваемся, што ў 1920-м годзе ён быў прадагентам і сапсаваў сабе кар’еру тым, што, адказваючы на пытанні анкеты, жартуючы, напісаў: “<…> да рэвалюцыі быў буйным землеўласнікам, меў 300000 акраў чарназёму, быў сакратаром пасольства ў Лондане. І шмат яшчэ чаго нахлусіў” [2, с. 6]. За такі “жарт” адседзеў пад арыштам у “блыхарні”, пакуль добра высветлілі, што ніякім буйным землеўласнікам і сакратаром пасольства ён не быў.

Самсон Самасуй падкрэслівае: “Я з мужыкоў” [2, с. 3], – і вельмі ганарыцца гэтым. І дзед, і бацька яго былі мужыкамі, сам ён мае “мужыцкі твар і асабліва нос у форме бульбы” [2, с. 3], а галоўнае – “розум мой ёсць розум выразна мужыцкі” [2, с. 3]. У гэтага прайдзісвета розум настолькі скрыўлены, што на любыя тэмы ён разважае нейкім асаблівым афіцыйным стылем. Ён карыстаецца канцылярызмамі, бюракратычнымі моўнымі штампамі не толькі ў палітвыхаваўчых гутарках з несвядомымі людзьмі ды лекцыях пра міжнароднае становішча, але і ў побыце, з бацькамі, пры выяўленні сваіх “пачуццяў” да Крэйны і жонкі Сома. Мова Самсона Самасуя становіцца смешнай і тады, калі ён хоча спадабацца прыгажуні Крэйне. Тады ў творы сустракаюцца перайначаныя на бюракратычны лад афарызмы, фразеалагізмы, прыказкі і прымаўкі: “Каб яе Пярун па галаве смалянуў” [2, с. 35]; “Ляцеў, як анёл, а ўдарыўся, як чорт!” [2, с. 39]; і інш.

Мову іншых герояў А. Мрый таксама робіць адмысловай. Напрыклад, бухгалтар РВК таварыш Лін, гаворачы пра свае пачуцці, выказваецца так: “Калі гляджу я ў твае вочы, я забываюся на прафсаюз” [2, с. 37]. Гэта выразна сведчыць, што чалавек абсалютна недасведчаны, недалёкі. Яго мова выглядае нежывой, “бюракратызаванай”, што дапамагае выкрыць у яго асобе прайдзісветаў і кар’ерыстаў. Гэтыя сродкі насычаны моцнай сатырычнай экспрэсіяй і трапна характарызуюць герояў. Д. Бугаёў слушна заўважае: “<…> само камічна перакручанае слова смяецца з Самасуевай дурноты, якой ён, вядома ж, не заўважае. Наадварот, ён яўна прэтэндуе на прыгожую вучоную мову, аздобленую гучнымі ідыёмамі, а атрымліваецца канфуз, тым больш, чым большая гэтая прэтэнзія, бо ідыёмы і ходкія так званыя крылатыя словы разбураюцца іх недарэчным ужываннем. Недарэчным з пункту гледжання менавіта высокага стылю сур’ёзнай размовы, але вельмі трапным у плане сатырычным, для дасягнення камічнага эфекту” [3, с. 240].

Самсон Самасуй – мужчына ў росквіце сіл, прыгожы, самаўпэўнены, дасведчаны, перспектыўны ў кар’ерным плане. З колькасці “прычындалаў”, дарэчы, кпіць аж родны бацька, але што ён селянін, можа ведаць пра стыль! Гэта ўсё выклікае і смех, і смутак адначасова. Такія ж пачуцці выклікаюць сляпая вера ў савецкую ўладу. Чалавек становіцца бяздушным робатам, чаму спрыяе ўсеагульная непісьменнасць. Напрыклад, вытрымка з анкеты працаўніка: “1. Пасада… мястэчка Шапялёўка Магілёўскай акругі. 1. Прозвішча… страшны агент, як кажуць сяляне. 4. Як па бацьку… сын селяніна. 5. Сацыяльнае паходжанне... згодна тэорыі Дарвіна. 8. Асвета... электрычнасці няма, выключна газай. 11. Маёмасць... жонка, трое дзяцей” [2, с. 137].

Для выкрыцця пікара аўтар выкарыстоўвае такі сатырычны прыём, як гаваркія прозвішчы. Самсон Самасуй суне свой нос куды трэба і куды не трэба, сам сябе назначаючы начальствам. Самсон – біблейскае імя, што павінна азначаць сілу, веліч, магутнасць яго носьбіта. Але ў творы А. Мрыя ўсё наадварот: Самсон увасабляе бязглуздасць, духоўнае ўбоства і фізічную непаўнацэннасць. У рамане прысутнічаюць настаўнікі: Мамон, Гыля, Юрлік, Крутарожка, суддзя Торба, старшыня прафбюро Мілёнак. Многія прозвішчы – гэта імёны жывёл, птушак, рыб: Сом, Лін, Курапат,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Курыца, Галавасцік, Беларыбка і інш. Як заўважае П. Васючэнка, “«заалагізму» імёнаў пасуюць паводзіны, духоўнасць персанажаў, дзейнасць – або па-рыбінаму замаруджаная, або па-птушынаму мітуслівая, але ў кожным выпадку пазначаная «якімсь адхіленнем ад нормы»” [4, с. 265]. Як бачым, у рамане няма станоўчых герояў, жыццё шапялёўцаў паказваецца А. Мрыем праз перабольшванне адмоўных рыс, травестацыю, гратэск. І толькі тыя вяскоўцы, хто наведвае сходы Самасуя, заслугоўваюць павагу чытача. Да яго прамоў яны ставяцца крытычна, але гэтыя персанажы эпізадычныя.

А. Мрый прымяняе ў творы прыём сатырычнага завастрэння абставін, сітуацый, фактаў, характарыстык герояў. Для паказу недарэчнасці бюракратызму даваеннага жыцця пісьменнік невыпадкова згадвае вялікую колькасць пасад, якія займае Самсон Самасуй. Вось яго абавязкі і функцыі: “Я – сябра РВК, старшыня дзіцячай камісіі, старшыня т-ва «Прэч несвядомасць», т-ва «Няхай гадуюцца дзеткі». Я – сябра праўлення т-ва прыхільнікаў «здахаты на буржуазею». Я – раённы інспектр працы і павінен бараніць служачых ад эксплуататарскіх замазаў загадчыкаў устаноў. Я – сябра жаночай камісіі РВК. <…> Я райліт і райахова здароўя, райМОПР, райхім. А самае дзіўнае для мяне – гэта тое, што я сябра раённай абортнай камісіі” [2, с. 52]. Навідавоку тое, што ўсе героі нагружаны шматлікімі грамадскімі абавязкамі, на што аўтар з гумарам звяртае ўвагу чытача. Напрыклад, настаўнік Мамон быў яшчэ і нейкім загадчыкам, рэвізорам сямі ўстаноў, а таксама штатным прамоўцам на ўсіх пасяджэннях і нарадах. “У гэтым сатырычным завастрэнні праглядае неразбярыха паслярэвалюцыйных часоў, калі дылетанты і розныя вылучэнцы браліся за ўсё на свеце” [3, с. 237], – адзначае Д. Бугаёў.

У творы А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя” аб’яднаны разнастайныя сродкі сатырычнага высмейвання: камізм сюжэта, парадаксальнасць і анекдатычнасць сітуацый, казусуальнасць, сатырычная ацэначнасць, якая даецца Самасуем іншым героям, іранічная насмешлівасць, сатырычная эфектнасць партрэтаў, мовы герояў. “Раман А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» – вяршыннае дасягненне псіхалагічна напоўненай беларускай сатыры,з глыбокім і непаўторным зместам, як і кожны высокамастацкі твор. Адметнасць яго заключаецца і ў абагульняльным развароце сатырычных карцін, і ў выбары самога аб’екта сатырычнага высмейвання, і ў разнастайнасці выкарыстаных сродкаў сатырычнай абмалёўкі персанажаў, і ва ўменні парадзіраваць факты, падзеі, з’явы” [5], – зазначае С. Шчэрба.

Асноўная ідэя твора – выкрыццё дурня пры ўладзе. Раман “Запіскі Самсона Самасуя” ў свой час успрымаўся крамольным, бо шматлікія прыстасаванцы, якія выкарыстоўвалі новую ўладу, каб самім жыць як мага лепей, вострай сатыры цярпець не маглі. Ідэя рамана не дэкларуецца, а арганічна вынікае з яго мастацкай сутнасці. Нягледзячы на пэўныя прабуксоўкі ў асобных месцах, дзе пісьменнік не развівае мастацкі характар, не вядзе свайго героя наперад, выпрабоўваючы яго ў новых, сацыяльна значных сітуацыях, а толькі запаўняе прастору твора апісаннем досыць аднатыпных, хоць і цікавых саміх па сабе, сітуацый, у сваёй аснове “Запіскі Самсона Самасуя” – твор іскрысты, парадаксальна-нечаканы, да авантурнасці займальны, насычаны нястрымнай фантазіяй пісьменніка, які ўмеў глядзець на жыццё весела, задзірыста, заўважаючы ў людзях малыя і вялікія скрыўленні і хібы.

Такім чынам, прыкметы пікарэскі, якія выкарыстоўвае А. Мрый у рамане з мэтай выкрыцця прайдзісвецтва і кар’ерызму, духоўнага жабрацтва і маральнай разбэшчанасці, наступныя:

1 аповед вядзецца ад імя галоўнага героя Самсона Самасуя;

2 пры гэтым, хоць А. Мрый і дае герою-пікара права быць суддзёй акаляючай яго рэчаіснасці, у структуры рамана пікара-наратар, пікара-дзеючая асоба, а таксама аўтар твора валодаюць адносна самастойнымі пунктамі гледжання, на якіх і будуецца мастацкае цэлае “пікарэскнага рамана”;

3 дзеянне рамана паказваецца кожны дзень;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4 сатырычнае адлюстраванне грамадства і сацыяльных падзей, дзе часам камізм суседнічае з трагізмам;

5 раман складаецца з асобных навел-прыгодаў героя, змешчаных у жорсткую рамачную канструкцыю ў выглядзе дзённіка; такім чынам, кампазіцыя “пікарэскі” заснавана на парадаксальным спалучэнні “закрытасці” і “адкрытасці”: пікара вядзе аповед аб сваім жыцці з моманту свайго нараджэння і да часу, да якога прымеркавана апавяданне, што прадугледжвае магчымасць яго працягу;

6 вялікую ролю ў рамане адыгрывае “пралог”, які ўключае тэкст пікарэскі ў сітуацыю зносін аўтара і героя-апавядальніка з чытачом;

7 часта выкарыстоўваюцца прастамоўныя і нават грубыя словы і іншыя сродкі моўнай выразнасці, у іх можна бачыць адлюстраванне моўнай карціны свету, уяўленняў і рэакцый на пэўныя з’явы.

8 вобразу Самсона Самасуя ўласціва пратэістычнасць.

Таксама ў творы прысутнічаюць агульныя рысы як для пікарэснага рамана, так і для авантурнага. Да іх адносяцца дынамічнасць сюжэта і тое, што твор разлічаны на масавую публіку. Адметнасцей, якія адносяцца толькі для авантурнага рамана, у творы не назіраецца.

**Літаратура**

1 Штэйнер, І. Смехъ зъ болѣстию смешанъ будеть : смехавыя традыцыі Рэнесансу ў сатырычнай літаратуры XX стагоддзя / І. Штэйнер; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя. Ф. Скарыны, 2017. – 141 с.

2 Мрый, А. Запіскі Самсона Самасуя / А. Мрый. – Мінск : Папуры, 2015. – 172 с.

3 Бугаёў, Д. Дасягнутае і страчанае / Д. Бугаёў // Полымя. –1993. – № 12. – С. 229–248.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4 Васючэнка, П. Рэпрэсіраваны смех : Роздум над лёсам і творчасцю беларускага савецкага празаіка Андрэя Мрыя / П. Васючэнка // Роднае слова. – 1989. – № 3. – С. 38–42.
5 Шчэрба, С. Станаўленне і развіццё сатырычнай традыцыі ў беларускай літаратуры : стылявыя плыні, жанравы аспект / С. Шчэрба. – Брэст : Альтэрнатыва, 2009. – 180 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ